## ПАВОДЛЕ БАЦЬКОЎСКАГА ЎСПАМІНУ

Я помню сумны бацькаў успамін:
Яму яшчэ ва ўзросце хлапчука
Лёс выпаў — з веданнем сваіх мясцін
Вадзіць па іх сляпога жабрака.
То на пачатку нашага стагоддзя, —
Падкрэсліваў ён, — час жа быў такі,
Калі сярод радзімічаў на ўсходзе
Жылі з панамі побач жабракі.
Яны ў мальбе звярталіся да неба
І да сваёй зямлі, яе дарог,
Каб хоць скарынку бог паслаў ім хлеба,
Іх у малітве абнадзеіць змог.
Часцей ішлі тады, калі ўжо ў гумнах
Запахне хлебам з першай малацьбы.
Ніхто ім не асмельваўся бяздумна
Сказаць, каб не-насілі крыж мальбы.
Не марылі ні ў якія часіны,
Каб адшукаць у краі нейкі скарб.
Па ўхабінах прыбесядскай даліны
Ішлі без жалю, літасці і скарг.
Дымілі з комінаў на золку вёскі,
Шлях вёў ад роднай Ліпаўкі ў Альшоў,
Дзе спелі ўздоўж ячменныя палоскі,
На праслах многа сохла гладышоў.
Не ўсюды ветліва маглі прымаці
Старцоў, яны ж маліліся за ўсіх.
За прадзедаў, дзядоў, за бацьку, маці,
За іх дзяцей і за сябе саміх.
Хадзілі так святочным днём і ў будзень,
Бо не адзін са старцаў жабраваў.
А Бог таго ніколі не асудзіць,
Хто жабраку скарынку падаваў.

Бывала — доўга з ранку і да ночы,
Там, дзе крыляюць над ракой стрыжы, —
Ідзе з малым стары, не бачаць вочы,
Далонню гладзіць ручніка брыжы.
Там ручніком скарынка хлеба ўкрыта,
А мо яшчэ й скаромінкі шматок.
І над сівою галавой нібыта
Кудысь жар-птушка адляцела ўбок.
Пераступаюць зморанныя ногі
Далей па сцежках вузкіх палявых.
Пад сонцам спее жыта ўздоўж дарогі,

За той хлеб-соль, што падаюць яму.
Ён не хавае ў сэрцы анічога,
Бо родную зямлю жабрак Аўхім
З маленства палюбіў навек, нябога,
Сам з ёй гатовы падзяліцца ўсім.
Не ганіць ён ні ў чым сваю дарогу,
Што пад яго ўцяняецца сумой.
Гатоў аддаць душу сваю ўсю богу,
І за яго сам стаць зямлёй самой.
І ў жабрака ёсць пачуццё святое —
Зямля сама дапамагае йсці,
Бо ёй — зямлі — усё належыць тое,
Што хутка так змяняецца ў жыцці.
Не толькі зернем родны край усеян,
Усіх нягод не ўзважыць на бязмен.
Шмат нечаканасцей нясуць падзеі,
Жыццё суцэльных поўна перамен.
Чым дыхае, жыве зямля навокал,
Што на сваіх плячах яна нясе, —

## *Пятро Прыходзька*

**Прапаную маім дарагім землякам-хацімчанам адзін з новых невялікіх твораў, напісаных у апошні час маёй творчай працы — пра сваю малую радзіму, пра тое, што бачыў і перажыў на ёй сам, а таксама мае продкі. Хоць мне ўжо хутка споўніцца восемдзесят гадоў, але не складаю свайго пяра і часта ў думках вяртаюся да вас, мае дарагія землякі.**

**Аўтар.**

Сляпы не бачыць заімглёным вокам, —
Яе ж дары ён адчувае ўсе.
За час, што азарае неба просінь,
І промні светлыя нясе свае,
За хлеб, які ён у радзімы просіць,
Ён ёй любоў сваю ўсю аддае.

* * *

Сляпога старца ўзяўшы за руку,
Яго малы ў дом павадыр увёў.
І тут такую клічку жабраку
Хтось даў — што цяжка робіцца ад слоў.

Расінкі піў з лісточкаў спарына.
Бывае шмат хто бедным, ды не можа
Ні ў кога быць жабрачаю душа.
Радзіма-маці, ўся зямля, якую
Ты змог уздоўж і ўпоперак прайсці, —
Табе падорыць песню зноў такую,
Якой ты сам не чуў яшчэ ў жыцці.
Свет ведаў і паэтаў, і музыкаў,
Ў якіх і ні граша ўжо не было,
Але ж пасля планеце ўсёй вялікай
Іх творчасць несла сонца і цяпло.
І хто б ні быў твой продак незабыты —
У самай цеснай сувязі з зямлёй
Табе ён перадаў свой кут абжыты,
З найлепшым скарбам — моваю сваёй.

* * *

Пасля вайны заўсёды шмат салдатаў —
Кантужаных, бязногіх і сляпых, —
Блукаюць па вагонах і па хатах
Пад гукі песень горасных сваіх.
Мне не забыць, як інвалід аднойчы —
Сляпы салдат заходзіў у вагон:
Шырэй гармонік расцягнуў —
што мочы —
І заспяваў працягла, гучна ён:
«Ты слепого меня не жалей-ка,
Ты слепого порадуй во мгле.
Покатилась далеко копейка
По зелёной и круглой земле!..».
Тая песня, бы з магілы брацкай
Крылы надарваныя ўзняла.
Але ж доля не была жабрацкай,
Калі ў бой байца таго вяла.
Сёння ў сэрцы нейкае сумненне —
Што жыццё нясе нам у адказ?
І, прызнацца, ўжо няма натхнення
З пафасам заканчваць гэты сказ.
Не магу глядзець, як ветэраны
У праходзе людным у метро
Напаказ свае старыя раны
Выстаўляюць, як і ўсё нутро.
Вось адзін трубач стаіць ад рання
Аж да самай позняе пары:
Можа, хто падкіне падаяння,

Сінее луг — ды толькі не для іх.
Але пакуль жа тое сонца свеціць, —
Ніхто іх не пакрыўдзіць з землякоў.
Гавораць жа — не вечна будзе ў свеце
Столькі з панамі побач жабракоў...
Яны папрокамі ўжо сыты нейчымі, —
Ды ўсюды адчуваюць пад імжой:
Багатыя ёсць людзі хлебам, рэчамі, —
Але занадта бедныя душой.
Казаў паэт, што «бог няроўна дзеліць»,
Не хоча нехта некаму ўгадзіць.
Сляпому ж жабраку лепш у нядзелю
Па вёсцы з хаты ў хату пахадзіць.

* * *

Жабрак — батрак нябёсаў і палёў,
Праз плыні цёплых і халодных дзён
Тым шляхам, у які нядолю ўплёў
Ідзе, не знаючы спачыну, ён.
Пад ім зямля, зара над галавою,
Кій у руках і торба на плячы,
Пра свой начлег, пра кут цяплейшы
свой ён
Таксама марыць, шляхам ідучы,
Хоць у яго ўласнасці ніякай
Апроч таго, што ён кладзе ў суму, —
Ён кожнаму паклоніцца з падзякай
У доме тым — багатым ды скупым —
Ў парозе прыпыніліся яны,
Ніхто нічога не падносіць ім.
Пякуцца ў печы смачныя бліны.
Выцягвае жанчына на патэльні
Бліноў пшанічных цэлую гару.
О, як хацелася малому вельмі
Хоць бы паўбліна ў раннюю пару.
Стары стаіць ля самага парога, —
Ад жару ў печы аж увесь упрэў.
А павадыр малы, згадаўшы бога,
Прамовіў голасна: «Цёць, блін згарэў!».
Агарак цётка кінула малому —
Нібыта ўбіла ў сэрца нейкі клін.
І ўжо сялянскі хлопчык з таго дома
Пайшоў з мянушкаю: «гарэлы блін».
На брак не паскупілася жанчына,
Хоць надта ўжо скупой яна была.
Пасля далей ад бацькі і да сына
Мянушка тая з часам перайшла.

* * *

Шукаць, чытач, не трэба параўнанняў
Былых гадоў з сягоняшнім жыццём.
Усе мы розныя, у розных званнях,
Кудысьці ўсё імкнёмся, ўсё ідзём.
Сам у жыцці ты зведаў бездарожжа,
Несучы зямлі сваёй дары?
У музыкі сумнае аблічча, —
Ўсё стаіць на месцы на адным.
І труба яго кагосьці кліча
Голасам ахрыплым медзяным.
Пра даўно забытую Кахоўку
Грае ён мелодыю адну.
Хтосьці ў шапку кінуў сторублёўку
Бы пясочку жменьку на труну...
Вунь яшчэ з гармонікам пявучым
Незнаёмы хлопец малады.
Цяжка зразумець — чым гэтак змучан
У свае ён юныя гады?
Не магу пачуць, што ён гамоніць,
Ці заўважыць — што ў яго душы.
І не так яго пяе гармонік,
Як тады ў вагоннае цішы...
Вось такія мне навеяў думкі
Даўні сумны бацькаў успамін.
І, напэўна, гэткіх песень гукі
Сёння чую ў нас я не адзін.
Кім ні быў бы ты, якім бы імем
Не ўслаўляў цябе жыццёвы лёс, —
Аддавай усю любоў Радзіме,
Вечнасці яе палёў, нябёс!

Жнівень 1997 г. — красавік 1998 г.

**Прыходзька, П. Паводле бацькоўскага ўспаміну** / Пятро Прыходзька // Шлях Кастрычніка. —1998. — 18 ліпеня. — С. 2.